Сяргей Чыгрын
(Слонім)

Эпісталярная спадчына Гальяша Леўчыка. Варшаўскія пісьмы

Беларускі паэт, празаік, перакладчык, калекцыянер, мастак Гальяш Леўчык (Ільля Ляўковіч) нарадзіўся 20 ліпеня 1880 г. у Слоніме, куды пераехаў яго бацька з-пад Ружан у пошуках „шчасця-долі ў шырокім свеце". Гальяш скончыў Слонімскае гарадское вучылішча, служыў пісарчуком у каморніка, а пасля ў канцылярыі міравога суддзі.

Набыўшы на курсах прафесію чарцёжніка, у 1904 г. ён падаўся ў Варшаву. Спачатку ўладкаваўся на працу чарцёжнікам у гарадскі магістрат і наведваў лекцыі ў школе мастацтваў. За гэты час Леўчык знаходзіць у Варшаве шмат беларусаў, знаёміцца з імі, арганізоўвае сустрэчы, ладзіць вечарыны. Першая інфармацыя пра беларускую дзейнасць Гальяша Леўчыка і яго сяброў у Варшаве змясціла „Наша ніва" 1 (14) снежня 1911 г. Аўтар Саўка Бурывой (Рамуальд Зямкевіч) паведамляў, што 21 лістапада адбылася вечарына студэнтаў-беларусаў Варшаўскага ўніверсітэта. Аўтар пісаў пра нейкага Пшчолко, які „гаварыў на сцэне сьмешных казак у расейско-беларускай гутарцы", пра маленькую дзяўчынку ў пекнай беларускай апратцы, якая мовіла словамі Янкі Купалы: „Чаго нам трэба" і „Чаго б я хацеў"... Пасля пра другую дзяўчынку, якая чытала верш „Не цурайся мяне, панічок" і „Панскую ласку". Потым на сцэну выйшаў Гальяш Леўчык, якога, як апісвае аўтар, „мы ўбачылі на лаўцы хвораго, слабого, ледзь жывога мальца беларуса, у зграбнай сарочцы, прыкрытаго старэнькай сьвітай — тып праўдзівага беларуса-мужыка. Быў то малады песьняр Леўчык Гальяш. Ён слабым голасам пад гітару прапеяў: „Мне трэба ўмерці" і апрыч таго пасьля шмат чаго дэклямаваў. Усё выпаўніў шчыра і публіцы надта спадабаўся"[1]. Далей выступаў хор, які спяваў беларускія песні.

Жывучы ў Варшаве, Гальяш Леўчык сабраў вялікую і каштоўную бібліятэку. Ён калекцыянаваў усё беларускае: кнігі, паштоўкі, творы мастацтва, музычныя інструменты, значкі, фотаздымкі. На жаль, у гады Другой сусветнай вайны ўсё гэта бясследна прапала. Але гэта было пазней. А тады кожнаму беларусу Варшавы і беларусам, якія прыязджалі сюды, Гальяш Леўчык з радасцю паказваў сваю калекцыю, дапамагаў матэрыяламі ў напісанні той ці іншай працы. Хачу адзначыць, што тады ў Варшаве жыў і яшчэ адзін беларускі калекцыянер кніг і ру-

[1] „Наша Ніва", 1 (14) снежня 1911 г., № 47-48.

капісаў Рамуальд Зямкевіч(1881-1944). Ён нават быў больш заўзятым калекцыянерам і бібліяфілам, чым Леўчык. Кажуць, што Зямкевіч быў такі заўзяты бібліяфіл, што не прапускаў ніводнае старое беларускае кніжкі, асабліва, калі яна „дрэнна ляжала". У выніку ён сабраў найвялікшую калекцыю рарытэтаў, але, на жаль, і яго ўся калекцыя згарэла ў вайну. Добра, што Рамуальд Зямкевіч хоць паспеў апублікаваць некаторыя рукапісы ў друку. Не ведаю толькі, як яны мірыліся і сябравалі — два калекцыянеры, два вялікія аматары беларускіх кніг — Рамуальд Зямкевіч і Гальяш Леўчык.

У 1913 г. на курсы садоўніцтва, агародніцтва і пчалярства прыехала ў Варшаву Зоська Верас (Людвіка Войцік). Там яна пазнаёмілася з Гальяшом Леўчыкам. Аднойчы яе і Марысю Галубянку, якая жыла ў Варшаве і працавала настаўніцай у школе Вавэльбэрга, Гальяш паклікаў да сябе ў госці. „Жыў тады Леўчык на вуліцы Леапальдыны, 35, кв. 32. Кватэра была, здаецца, на трэцім паверсе", — згадвае Зоська Верас[2]. Далей Зоська Верас прыгадвае: „Пакой здаваўся вузкім, таму што яго-ная сцяна была абсталявана даволі шырокімі паліцамі ад падлогі да столі. І на іх стаялі кніжкі, кніжкі, кніжкі... Сапраўды, гэта была вялікая, цікавая і каштоўная бібліятэка. Сабранае было хіба што ўсё, што выйшла з друку ў беларускай мове... Усе паліцы былі ўпрыгожаныя партрэтамі пісьменнікаў, паштоўкамі, краявідамі. Шмат што было купленае, але й шмат падараванае аўтарамі ды знаёмымі. Тыя кнігі, што сталі ніжэй, мы з Марысяй аглядалі самі, а тыя, што высока, Леўчык здымаў і паказваў сам. Не адну гадзіну гэты занятак забраў нам. Нарэшце Гальяш сказаў: — Ну й замучыў я вас... Пара адпачыць! — Мы адмаўляліся, не жадаючы клопату, але былі змушаныя пагадзіцца. Пілі добра прыгатаваную гарбатку, і да яе было сёе-тое смачнае. Пасля Леўчык прапяяў нам пару песняў пад акампаніямэнт гітары. Голас меў прыгожы. Пяяў і граў умела. Развіталіся мы з ім позна вечарам[3]".

Калі я сустракаўся з Зоськай Верас у Вільні ў 1987 г., то таксама запытаўся ў яе пра Гальяша Леўчыка. Пісьменніца вельмі цёпла ўспамінала пра яго. Расказала мне пра тое, як Гальяш Леўчык у Варшаве пазнаёміў яе з многімі беларусамі. Яны часта ездзілі ў Ажарова, што пад Варшавай, да беларускай сям'і Сталыгваў, якія там мелі свой дом. Памятаецца, як Зоська Верас мне згадвала і пра тое, што Леўчык лічыў сваім абавязкам ведаць кожнага беларуса, які прыязджаў у Варшаву, прыцягнуць у сваю групу, каб ён не згубіўся ў людскім моры і не забываўся сваёй мовы, як ён сам казаў. А калі беларусу не было дзе начаваць, ён клікаў яго да сябе ў маленькую кватэру на вуліцу Леапальды-

[2] „Рунь" (Літва), 3 жніўня 2000 г.

[3] Там жа.

ны. Неяк Гальяш Леўчык завёў Зоську Верас і да Міхала Федароўскага, які прыняў іх шчыра і ветліва.

У 1919 г. у Варшаве арганізоўваецца Беларускі камітэт. Вакол яго хутка згуртаваліся многія вядомыя беларусы Варшавы, якія актыўна пачалі пашыраць нацыянальную свядомасць. Часопіс „Беларускі летапіс" пісаў, што Беларускі камітэт выпісваў усе беларускія газеты і часопісы, а таксама кніжкі[4]. З іх была створана бібліятэка. А Гальяш Леўчык быў адным з самых актыўных сяброў камітэта. У Слонімскім раённым краязнаўчым музеі захоўваецца адзін фотаздымак. На здымку фатограф зрабіў надпіс на беларускай мове лацінкай: „Беларускія валасныя старшыны Слонімскага павету Гарадзенскай губерні". У кожнага з іх маецца на грудзях медаль. На адваротным баку здымка ёсць штамп „Беларускі камітэт у Варшаві" і круглая пячатка з такім жа надпісам. Магчыма фотаздымак у Слонім трапіў праз Гальяша Леўчыка[5]. Гэта ён фотаздымак прывёз з Варшавы пасля таго, як не стала там Беларускага камітэта ў 1922 г. Яго дзейнасць была спынена тадышняй польскай уладай.

У 1922-1930 гг. беларускі рух у Варшаве не меў актыўнай дзейнасці. У 1928 г. зямляк Гальяша Леўчыка — Павел Крынчык быў выбраны паслом польскага сейма па спісе, выстаўленым КПЗБ. Павел Крынчык некалі згадваў, што быў добра знаёмы з Леўчыкам. Гальяш Леўчык часам заходзіў да яго ў беларускі пасольскі клуб „Змаганьне", які месціўся ў Варшаве на Маршалкоўскай, 76. Беларускія палітыкі ў Варшаве часам яму аказвалі фінансавую дапамогу.

У 1930 г. у польскай сталіцы ствараецца Саюз беларускіх студэнтаў у Варшаве. Разам з віленскімі студэнтамі беларускія хлопцы і дзяўчаты з Варшавы ладзяць розныя цікавыя мерапрыемствы: выступаюць з лекцыямі, дэкламацыямі літаратурных твораў, з тэатральнымі пастаноўкамі і г.д. Праіснаваў гэты Саюз усяго тры гады і дзейнасць яго была спынена польскай уладай. Гальяш Леўчык у гэты час працуе служачым у Найвышэйшым судзе ў Варшаве і актыўна перакладае рэлігійную літаратуру метадыстаў на беларускую мову. Гэтыя пераклады з'яўляліся ў выданнях „Арфа Сіону", „Новае Жыцьцё" і „Дух Праўды". За пераклады, вядома ж, ён атрымліваў пэўны ганарар. Таму актыўнага ўдзелу ў Саюзе беларускіх студэнтаў у Варшаве ён не прымаў. Але там бываў, даваў кансультацыі, парады, выступаў перад студэнтамі.

Гальяш Леўчык вёў вялікую перапіску з беларускімі дзеячамі. З Варшавы ён пісаў пісьмы ў Вільню, Гародню, Слонім, Пецярбург, Менск, Прагу. Але найбольш лістоў дасылаў у Вільню. Ён перапісваўся з рэдак-

[4] „Беларускі летапіс", 1938, № 4, с.11.

[5] У родным Слоніме ў Гальяша Леўчыка была хата і вялікая калекцыя старых рэчаў, кніг, паштовак і г.д., большая нават, чым у Варшаве.



Гальяш Леўчык (трэці злева) з землякамі, 1905 г.



Гальяш Леўчык (стаіць справа), Язэп Драздовіч (стаіць злева) у дзвярах, Антон Грыневіч (стаіць справа на пярэднім плане), астатнія — невядомыя, 1930-тыя гг.



Гальяш Леўчык у Варшаве,1941 г.

цыямі беларускіх газет і часопісаў, а таксама з Ігнатам Дварчанінам, Уладзіславам Знамяроўскім, Кандратам Лейкам, Зоськай Верас, Іванам і Антонам Луцкевічамі, Янкам Маразовічам, Эдвардам Будзькам, Вацлавам Ластоўскім, Янам Пятроўскім і іншымі дзеячамі беларускай культуры. У пісьмах ён распавядаў пра сваё варшаўскае жыццё, пра калекцыянаванне, пісаў, напрыклад, Луцкевічам, якія старыя кнігі і рэчы траплялі яму на вочы і ў каго яшчэ яны захоўваюцца ў Варшаве, колькі яны каштуюць, набываў іх і вазіў у Вільню ў беларускі музей Луцкевічаў, альбо дасылаў поштай. Вельмі хацеў Гальяш Леўчык у міжваенны перыяд выдаць кірыліцай свой зборнік вершаў „Чыжык беларускі”[6]. А таксама жадаў апублікаваць і свой новы паэтычны зборнік „Беларускі жаваранак”.

Пісьмы Гальяша Леўчыка раскіданы па архівах Польшчы, Літвы, Беларусі, Расіі і ЗША. У Рукапісным аддзеле Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы (фонд 21, справа № 286) захоўваецца вязанка варшаўскіх пісем Гальяша Леўчыка да Івана і Антона Луцкевічаў, да Вацлава Ластоўскага і Эдварда Будзькі, у рэдакцыі „Нашай Нівы” і „Беларускага Звону”.

Пісьмы Гальяша Леўчыка ў рэдакцыі газет „Наша Ніва” і „Беларускі Звон”

1. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва” ад 05 (18).11.1910 г.

(экстренно)
гор. Вильно
Виленская ул. № 20
въ редакцию газеты „Наша Ніва”[7]
Эд[варду]. Будзько[8] альбо В[ацлаву]. Ластоўскаму[9]
5/18/XI 1910 г. Варшава (Леопольдыны, 35, м. 32 Э[льяшу]. Левковичу)

Дзеля нашага календара я тутака зьбіраю абвесткі. Здаецца ўдасцца мне здабыць з 4 вялікія фірмы „Альф[рэд]. Гродзкі”[10], „Спесс і Сын”[11],

[6] Зборнік вершаў *Čyžyk biełaruski* лацінкай пабачыў свет у Вільні ў 1912 г.

[7] „Наша Ніва” — беларуская газета, якая выдавалася ў Вільні з 10 (23).11.1906 па 7 (20).08.1915 г. і з 28.10 па 20.12.1920 г.

[8] Будзька Эдвард (1882-1958) — беларускі публіцыст, грамадскі дзеяч, кааператар. Нарадзіўся ў Будславе, памёр у Чыкага (ЗША).

[9] Ластоўскі Вацлаў (1883-1938) — беларускі пісьменнік, грамадскі і палітычны дзеяч, гісторык, філолаг, літаратуразнавец. Нарадзіўся на Глыбоччыне. Знішчаны НКУС у Саратаве.

[10] Склад сельскагаспадарчых машын, прылад і насення, рамонтныя майстэрні, Варшава, вул. Сенатарская, 33. Фірма была заснавана ў 1878 г.

[11] Фармацэўтычнае прадпрыемства, якое ў 1823-1944 гг. існавала ў Тархаміне каля Варшавы.

„К[шыштоф]. Брун і Сын"[12] і др., але яны кажуць, што трэба ім даці ўступку ад цэны абвестак. Напішыце, як найхучэй, сколькі дасьце % уступкі і назначце мне канцавы тэрмін высылкі абвестак, бо я ня ведаю, як зрабіці; раджу ім даць, бо яны абяцаюць кожны год даваць абвесткі. — Чакайце і на мяне мо з друкам — Гальяш Леўчык.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 2.*

2. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва" ад 15 (28).09.1911 г.

г. Вільно
Завальная вул. № 7
рэдакцыя газеты
„Наша Ніва"
Івану Луцкевічу[13] ў Вільні
15/28/IX 1911 г. Слонім (альбо хутчэй адпішыце),
чацьвер
Дарагенькі Братко!

Што за траф! Гэтаго п[ана]. Бубноўскаго[14] я сам добра знаю і ён мяне! Іх двох братоў — ён старшы Вацлаў, і другі малодшы гдзесьці ў двары ў якогасьці князя. Тутака жывець іх бацько — „падпольны адвакат". Яны з ім ня ў згодзі. У іх і сястра гдзесьці е. Але ў бацька Бубноўскага нічога нямашка, ёсьць толькі, казаў, стары гадзіннік ад караля Яна, але я яго яшчэ ня бачыў. Тым часам тутака ў мешчан адных я знайшоў у старой скрыні чыстую капальню, ажно высалапіў я вочы! Да 1000 старонак папераў — ад 1500 г. да 1800 г. Але ўсё аб Слоніме. Е каля 200 мо — і па беларуску (старым пісаным шрыфтам). Знайшоў з 5 каралеўскіх лістоў Стэфана Батораго[15], Казьмера[16], Ўладыслава[17], Яна III[18] — 5 каралеўскіх прывілегій з васковымі пячацямі ў бляшанках, на паргаміне — адна ў „кожанай" аправі (у шкуры). Шмат лістоў Радзівілаў[19],

[12] Варшаўская купецкая фірма, якая займалася продажам жалезных артыкулаў.
[13] Луцкевіч Іван (1881-1919) — пачынальнік беларускага нацыянальнага руху, беларускі археолаг.
[14] Бубноўскі Вацлаў (1865-1945) — кераміст, скульптар.
[15] Стэфан Баторы (1533-1586) — кароль Рэчы Паспалітай, вялікі князь літоўскі.
[16] Казімір IV Ягелончык (1427-1492) — вялікі князь літоўскі і кароль Польшчы.
[17] Уладыслаў III Варнэньчык (1424-1444) — кароль польскі і вугорскі.
[18] Ян III Сабескі (1629-1696) — польскі палкаводзец, кароль Польшчы.
[19] Радзівілы — літоўскі княжацкі род, прадстаўнікі якога займалі самыя значныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVI-XVIII стст. Адзін з самых уплывовых магнацкіх родаў у Рэчы Паспалітай.

Сапегаў[20], Патоцкаго[21], е нават ліст Чарнэцкаго[22], 2 прыказы караля Яна друкаваныя; лісты Вішневецкаго[23]. Ажно мне валасы дыбам сталі, калі я іх разглядаў. Паскладаў я іх роўна ў горбы, абвязаў паперай і зноў улажылі мы іх у скрыню. Шмат е ад вільгаці пагніўшых і збутвеўшых. Але, каб не даць ім знаць, што гэта я сказаў: „А мо прыгадзіцца калісьці якому вучонаму, але трэба было б іх аддаці ў музэй да Вільні”. Хаця яны, здаецца, змяркавалі, што гэта варта грошы. Ну, але, можна было б, здаецца, вымануць, хаця без грошай не абыйдзецца. Я цаны ім ня даваў, дзеля непазнакі. Вось сук, як зрабіць, каб купіць усё гэта!? Чысты «скарб — клад». Я да панядзелка тут прабуду. Як зрабіць? Мо прыедзьце, братко, паглядзімо! Толькі, ціха, ша! Расход і карысьць папалам!

Ехаць на Баранавічы, да мяне, але без мяне не пакажуць!

Гальяш Леўчык.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 3.*

3. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва” ад 23.09.1911 г.

г. Вильно

Георгиевский пр. № 4, кв. 10

«Техническая контора И[вана]. И[вановича]. Луцкевича и Д[оминика]. Семашко[24]»

Г[осподи]-ну Ивану Луцкевичу

Варшава, д. 23 верасьня 1911 г.

Дарагенькі і залаценькі Братко і Таварышу!

Я ўжо зноў у Варшаві. Аб гэтых паперах думаю «цо се одвлечэ — то не ўцечэ». Завіша — не Завіша, але вось, братко, што: усе гэтыя паперы, па мойму, варты каля паркі сот рублёў! Яны важны і цэнны асабліва дзеля Слоніма, бо ёсьць там унікаты. Аб іх я даўно ўжо ведаў! Брат цяперашняго мешчаніна — старэйшы, быў калісьці галавою ў думе слонімскай і жыў на нашай вуліцы, а як памёр, то скрынку з гэтымі паперамі забраў яго цяперашні брат, катораму ўжо будзе з 70 з гарою гадоў. Вось гэтыя паперы важны, асабенна дзеля мяне. Я ўжо даўно думаю і кратаюся напісаць і выдаць манаграфію Слоніма і павета ў асобнай

[20] Сапегі — шляхецкі род герба Ліс у Вялікім Княстве Літоўскім.

[21] Патоцкі Ян (1761-1815) — польскі пісьменнік-рамантык, археолаг, падарожнік.

[22] Чарнецкі Стэфан (1599-1665) — вайсковы дзеяч Рэчы Паспалітай, палявы гетман каронны.

[23] Міхал Карыбут-Вішнявецкі (1640-1673) — кароль польскі і вялікі князь літоўскі.

[24] Сямашка Дамінік (1878-1932) — беларускі і літоўскі грамадска-палітычны дзеяч.

кніжцы і сабіраю ўсё чыста, што датычыць Слоніма старога і новага. Перад выездам — у панедзелак — дай, думаю зайду туды да іх і папытаю, што будзе, ці згодзяцца аддаць іх у музэй. Ажно ж ён кажэ, што пакуль што, напіша да Вацюка Бубноўскаго, каторы летась у яго гасціў і перагледаў іх — як ён парадзіць. Гэты Бубноўскі, кажэ, успамінаў, што мае прыехаць адзін пан з Вільні (гэта пэўне Вы?!) і разгледзець, ці купіць! Калі яны напішуць да Бубноўскаго, то Бубноўскі пэўне напіша да вас. Дзеля гэтаго, братко, трэба нам будзе парадзіцца з сабою, каб як-нібудзь умело іх адтуль выдабыць. Мо вы самые ўпярод нечакаючу напішэце да Бубноўскаго, (калі ён гэта вас мае ў думцы, а не другога), што мо вось знаеце мяне, што вось вы, альбо я за вас магу набыць дзеля музэя — усё раўно — не кажучы яму, разумеецца, аб іх цане і нашай змове! Каб хто другі ня ўлез у параду. Помнійце, братко, што гэтые паперы надта для мяне важны! Незабудзьце, братко, да мяне аб гэтым заўсёды скрыпнуць!

Гальяш Леўчык.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 4.*

4. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва" ад 24.08 (06.09).1912 г.

г. Вильно

Завальная ул. № 7

«Наша Ніва»

Яго Міласьці

Івану Луцкевічу

д. 24 жніўня/6 верасьня 1912 р. Варшава

Ўважаемы Дзядзька Іван!

Я, як толькі прыехаў да Варшавы, то зараз, па вашай просьбі, пачаў шукаці гэтага жыда, што сьцяпіў гэрб з вашаго старога жырандоля, Вільгэльма Бэрэнштэйна[25], ажно ж ён, падла, выехаў у Кіеў 31 мая, а я прыехаў 7 ліпеня.

Ён выбыў із Ордынацкой № 13. Цяперака я ізноў там быў — няма яшчэ. Мо калісьці вернецца — толькі невядома калі і ці вернецца. Калі б ён вярнуўся, то я яго злаўлю! Ведаеце, Дзядзька, што Зем[кевіч].[26] проціў вас штосьці кнуе і я з кожным днём усё больш пераконваюся, што ў яго пагана натура — трэба, дзядзька з гэтых касовых кніжак добра

[25] Бернштэйн Вільгельм — яўрэйскі калекцыянер з Варшавы.

[26] Зямкевіч Рамуальд (1881-1944) — беларускі бібліёграф, гісторык літаратуры, публіцыст, перакладчык.

палічыці, сколькі ён за той і гэты рок „бухнуў”, каб меці довады пад рукою — мо прыгадзяцца! Але ж лгар так лгар, да яшчэ чмутар, звяднік і хвалько. Кажэ ён сам, што вы аб тым, які ён быў у Вільдэра[27], ведалі даўно перад прыездам яго да Вас. Ці гэта праўда? Ваш Гальяш.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 8.*

5. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва” ад 12 (25).08.1912 г.

г. Вильно

Завальная вул. № 7

«Наша Ніва»

Я[го]. М[іласці]. Дз[ядзьку].

Антону Луцкевічу[28]

д. 12/25 жніўня 1912 г.

Паважаемы Паночку!

Дзякуй Вам, паночку, за кніжкі, за памяць і за ўвагу да мяне дзеля страхоўкі і т.д.! Газэты Вам зараз заўтра вышлю — я нават і сам думаў паслаць іх вам. Да гэтай пары я быў вельмі заняты тутака ў выбарнай думе каля спіскаў, так што каля сябе ні пісаць, ні зрабіць нічога ня мог. А цяперака прыналягу і ўжо ўсе справы кончу. Я тутака пазнаў аднаго Йузэфа Луцкевіча — сваяка ўладара фабрыкі шчотак да зубоў Зелінскаго — ці ён часам ня будзе і ваш сваяк? Падзякуйце ад мяне таксама і пану І. за памяць і ласку і аддайце яму, а таксама брату Івану і Ўласту[29] паклоны!

Ваш Гальяш Леўчык.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 9.*

6. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва” ад 26.08.1913 г. з вершам „Кукавала зазулячка...”

г. Вильно

Завальная ул. № 7

«Наша Ніва»

в Редакцию

[27] Вільдэр Геронім (1876-1941) — вядомы варшаўскі антыквар і калекцыянер.

[28] Луцкевіч Антон (1884-1942) — адзін з пачынальнікаў, тэарэтыкаў і арганізатараў беларускага нацыянальна-вызвольнага і сацыялістычнага руху, старшыня Рады Народных Міністраў і міністр замежных спраў Беларускай Народнай Рэспублікі.

[29] Псеўданім Вацлава Ластоўскага.

Кукавала зазулячка...

Кукавала зазулячка за акном,
заплакала дзяўчыначка за сталом...
Кукавала зазулька ў бярозе,
заплакала дзяўчынка ў дарозе...
Кукавала зазулячка на дубе,
заплакала дзяўчыначка пры шлюбе...
Кукавала зазулячка на елі,
заплакала дзяўчыначка ў пасцелі...

Слонім. Запісаў Гальяш Леўчык

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 10.*

7. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва" ад 17 (30).01.1913 г.

г. Вильно
Георгиевский пр. № 4
Е[го]В[ысоко-]Б[лагородию].
Антону Луцкевичу
Варшава, д. 17/30 студня 1913 г.
Залаценькі Дзядзька Антон!

Часта мне прыходзіцца з варшаўскімі абрусеўшымі беларусамі-студэнтамі вясьці спорку і дыскусію на грунці беларускаго адраджэньня. Такая агітацыя часамі памагае зьдзерці ім з вачэй бельмо і я бачу, што многіе із іх чуюцца беларусамі, і з часам могуць быць і таксама наварочваць другіх. Але мала гэтаго — такая спорка змушае мяне зьвярнуцца да вас вось у якой справі:

1) Якіе толькі ёсьць яшчэ там у вас экзэмпляры вашай брашуры А. Новіны[30] „Белоруссы"[31] (па расійску) усе чыста выслаць мне, а яны зараз уміг будуць раскуплены, калі ў Вільні німаш, то мо ў Піцяры.

2) Трэба было б канешне вам, дзядзька, выдаць гэту брашуру 2-гі раз*), толькі, канешне, дапоўніць яе і ўставіць апіс: асобнасьці беларуса, яго характар, дадатнія стараны, чым ён рожніцца ад вялікаруса і маларуса, яго духовая спасобнасьць і т.д. Словам, высказаць, што беларус саўсім асобная натура і нацыя і павінна мець права да жыцця...

[30] Псеўданім Антона Луцкевіча.

[31] Маецца на ўвазе адбітак „Белорусы" Антона Луцкевіча з кнігі *Формы национального движения в современных государствах* (Санкт-Петербург 1909).

3) Прышлеце з 10 штук вашай адбіткі: „На дарозі да новаго жыцьця”[32].

Гальяш Леўчык

*) Гэта дапоўнена брашура (расійская) вельмі тут патрэбная. Сколькі 2 выданьне каштавала б?

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 11.*

8. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва” ад 12 (25).06.1915 г.

г. Вильно

Виленская ул. № 29

въ редакцію газеты

«Наша Ніва»

Яго Міласьці

Антону Луцкевічу

ў Вільні

Варшава д. 12/25 чэрвеня 1915 р.

Шаноўны і Паважаны Паночку!

Пры грымотах і перунах вялікай Еўрапейскай буры, аткрываецца для ўсіх меншых славянскіх і неславянскіх народаў і нацый, новая страніца гісторыі, свабаднейшаго жыцьця і мысьлі сваёй роднай нацыі!!!(?)

Даведаліся і мы, што цяпер у Маскве выйшоў № 1 расейскай часопісі „Національныя проблемы”, аб чым вы хіба ўжо ведаеце, дзе будуць выступаць пера прэдстаўнікоў усіх нацый і народаў, жывучых у Расеі, дзеля народна-культур(аль)ных патрэб сваёй нацыі!.. Вось мы, хаця і думаем, што вы, паважаны дзядзька, мо ўжо і бярэце (ці возьмеце) і свуй нароўні з другімі ўдзел у гэтай расейскай часопісі, каб вырабіць і для Беларусаў лепшу будучыню, шлем вам сваё: „Памажы Божа!!!”.

Беларусы, жывучыя ў Варшаві, Гальяш Леўчык і другіе.

Паклон усім! усім!

(Даўно, даўно ня бачыліся і ня гутарылі!! Як маецца Дзядзька Іван? Што ў Вас там агулам чуваць???)

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 12.*

9. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Наша Ніва” ад 26.06 (09.07).1911 г.

32 Маецца на ўвазе кніжка Антона Луцкевіча *На дарозе да новага жыцця* (Санкт-Петербург 1912).

Варшава д. 26 чэрвеня/9 ліпня 1911 г.

Браткі, Таварышы ў Рэдакцыі „Наша Ніва”

Жменька беларусаў у Варшаві хацела б пазнаці больш тутэйшых землякоў сваіх, каб лепш вязьці супольную справу.

Дзеля гэтаго просім Вас прыслаці нам іх адрасы і ўказаці нам нашых людзей, што жывуць у Варшаві і каля яе.

Пасылаючы Вам шчыры братні прывет, чакаем ад вас весткі аб тых беларусах, што вам ужо вядомы, і аб тых, што яшчэ будуць.

Гальяш Леўчык

Ромуальд Земкевіч

Язэп Гапуновіч[33]

Л. Дубейковскі[34]

В. Столыгво[35]

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 13.*

10. Пісьмо Гальяша Леўчыка Антону Луцкевічу ад 04 (17).07. 1911 г.

Варшава 4/17 ліпня 1911 г.

Шаноўны і Паважаны Паночку!

Сваіх прыяцелёў і знаёмых я люблю тытулаваць ці празываць: „Дарагенькі альбо залаценькі Братко-Таварыш!” Але да Вас, пішучы першы раз, яксьці — нязручно. Ну, але калі вам прыдзе калі небудзь ахвота скрыпнуць часам крышачку слоў да маёй мізэрнае хвігуры, то ўжо я ня выцерплю, а адважуся назваці „Братко-Таварыш”, а не „Паночку”. Шмат да каго я пісаў, да і да мяне шмат пісалі, а вось, каб ня Земкевіч, то бы я і да гэтай пары няведаў, што вы есьце на сьвеці, да і больш тамака вас ёсьць (апроч п. Ўласава, Ластоўскаго, Будзькі, нашых паэтаў і др.), хаця, ведама, думаў, што мусяло б быці! Але ўсё ж такі вы тамака лепш і часцей чулі і ведалі аб нейкім Гальяшу Леўчыку і хутчэй маглі б рыпнуць да яго лісток, дзеля грамадзянскай справы. Ну, але цяперака я сам магу пачаць з Вамі гутарку, дзеля таго, што мой Власт[36] неадзываецца да мяне, ня ведаю чаму, ці хворы, ці выехаў, ці можа я яго чымсьці прагневаў, але здаецца, не?..*).

Часам вось кажу, што мова — серабро, а — „маўчок” — золата!

Перш наперш, даведаўшыся аб тым і сім, што дзякуючы Вам і брату,

[33] Гапановіч Язэп (1883-1961) — беларускі грамадскі дзеяч, прадпрымальнік.

[34] Лявон Вітан-Дубейкаўскі (1869-1940) — беларускі архітэктар, будаўнік, грамадскі дзеяч, педагог, паэт.

[35] Сталыгва Уладзіслаў (1874 — ?) — беларускі грамадскі дзеяч у даваеннай Варшаве.

[36] Псеўданім Вацлава Ластоўскага.

„Наша Ніва” радзілася і жывець, што вы тамака цэлай „спружынай”, цэлым „маторам-машынай” беларускаго, хочацца мне з глыбіні сэрца падзякаваць Вам з братам за ўсе вашы труды, уложэны на цяжкай нашай ральлі, і за ўсю вашу працу дзеля адраджэння Беларускаго народу! І сьціснуць вашу працавітую руку! Няведаў я, што ёсьць такі сабе Земкевіч, каторы, прыехаўшы з Вільні, заглянуў да мяне. Будучы нексьці ў проф. Карскаго[37], я даведаўся аб ім і запісаў яго, ажно ж ён сам явіўся. Ну, і цікавы з яго, аднак, экзэмпляр, на сколькі я мог яго пазнаць. Но, бо як жэж? Хто тутака мог падумаць, што калісьці, нібы паляк, ды яшчэ радзіўшыся ў Варшаві, вось якую ідэю „злапаў”? Саўсім ён мяне здзівіў, асабліве дзеля знаньня беларускай бібльёграфіі. Ад яго я цяперака шмат чаго даведаўся. Калі ён не махлюе, ды духам няўпадзе і будзе ісьці крэпка, то сьмела можна сказаць, што вялікую карысьць з яго мы можам мець і аграмадную ўслугу ён калісьці Беларусі прынясе! Шкада, што нямаш яму, як там у Вільні альбо ў Варшаві пакуль што аперціся, каб матэрыяльна яму было лягчэй, а то, бедны, саўсім ужо вытрасся!.. Я яму крыху памог, але даўжэй трудна!

Але, здаецца, ён не махлюе, а кажэ праўду. Меў выдаць Власт цяпэрака сборную кніжку ў памяць Палуяна[38], ну і штосьці дзела загразло, пэўне грошай нямашака. Ён хацеў назваць яе „Вялікдзённая Пісанка” ці што, але Вялікдзень ужо даўно далёка ад нас, дзеля гэтаго „назова” гэта ўжо не гадзіцца. Але дзела гэта трэба было б давесьці да канца, бо на памяць нябошчыка-барца за Беларусь, толькі ўжо пад іншым „тытулам” („назовай”): „Беларускі Курган”. Грошы на гэта: 25 рублёў прыслаў я (і як я чуў), Грыневіч[39] і Земкевіч па 25 руб. = разам 75 руб. Даведайцеся, так нібы няхочучы, сколькі гэта ўсё каштавала б? Я часам пад ахвоту на гэты цэль мог бы крышку і грошы сабраць. Вы тамака добра ведаеце Власта — на від з пісьмаў ён, здаецца, нязгоршы, толькі, бадай, больш гаворыць і піша, чым (аб чым піша) робіць. Я на яго крышку сярдзіты: ён мае творы і вершы страшэньне змалоў, да і меле, праўда, што я сам крыху вінаваты, бо „зарэкамэндаваў” сябе нібы як „самавучка”, вось тагды рожные „самазванчые языкаведы” давай іх пілаваць у вас тамака на ўсе бакі, дай спілавалі. Эг філістры! Добра, што я на „амбіцыю” ня хварэю, а то крый Божа загарэлася б тагды страшэнная „палеміка”, ды і з „адваротнай” крытыкай, бо і я ж такі, здаецца, бадай што ня згорш знаю родную мову, да і дарма праз 30 гадоў хлеба ня марнаваў. Вось і прыгадзіцца калісьці выцяхаць і іхніе „быкі” са свайго капшука, гдзе ажні шэлесьцяць і просяцца а „крытычные жорны”. Ну, паглядзімо, пабачымо? Толькі

[37] Карскі Яўхім (1860-1931) — філолаг-славіст, заснавальнік беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнограф, фальклярыст, палеограф.

[38] Палуян Сяргей (1890-1910) — беларускі публіцыст, празаік, літаратуразнавец.

[39] Грыневіч Антон (1877-1937) — беларускі збіральнік музычнага фальклору, выдавец, педагог, кампазітар.

не кажэце і не давайце пазнаць, што я да вас пісаў і што гаварыў, бо гэта можа нэрвам зашкодзіць. „Я сабе скраю — нічога ня знаю!" Эг, здаецца, каб гэта я ўжо ў Вільні мог жыць! Загудзеў бы, зайграў бы, ажні край весь танцаваў бы! Але „ява" ня такая, як паэтычны сон**)... Калі ж мы дачакаемо філологічнаго зьезду?? Напішэце мне аб вашых думках, проектах, што тамака ў вас дзеецца, як робіцца, мо часам усё такі то тым, то сім прыгадзіцца вам ваш новы прыяцель

Гальяш Леўчык

*) Калі я ўжо кончыў пісаць гэты лісток, то разношчык прынёс пісульку ад Власта.

**) „Тамака добра жывецца, гдзе нас немашака".

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 11-13.*

11. Пісьмо Гальяша Леўчыка Антону Луцкевічу ад 31.10 (13.11). 1912 г.

Варшава д. 13/31-X лістопада 1912 г.

Залаценькі Дзядзька!

Такое канторы абвестак: «М. Гіммэльфарба» на Каралеўскай 25 у Варшаві ня было і нямаш — так сторож мне казаў, да і ў канторах абвестак аб такой фірме ня чулі і ў кнізе тэлефонаў яе нямашака. Будзьце асцярожны, дзядзька, бо тутака Жыды на ўсе рукі спасобны! Пры гэтым пасылаю вам распіску агентурную! Вось яшчэ, дзядзька, хуткая вельмі рэч: Тутака „Альф. Гродзкі" хочэ даць абвестку да Каляндара, але дае толькі тую самую цану 30 рублёў, што і ў прошлым року, за 1 страніцу ў двох выданьнях і на том самом месцы і тую самую абвестку, што і была (так што перакладу ня трэ рабіць). Дзеля гэтаго хутка адпішце, то ён прышле клішу! Я бы Вам радзіў прыняць, дзеля таго, што ён пэўне больш ня дасьць і што ў гэтым року менш будзе абвестак, ніж у том (я маю ўжо на 60 рублёў, а з ім то будзе 90-сят), і што ён ужо трэці раз абвешчваецца! Ён аб гэтым ужо пісаў быў да „Нашай Нівы" 22 кастрычніка, але вы адкажэце на маё імя, то я мо яшчэ патаргуюся! Але хутчэй! Ці не маглі б вы мне, дзядзька, пастарацца № 1 „Славянскія известія". Тамака есьцяка надруковано аб Беларусах — вы знаеце — рэдакцыя ў Маскве (вышоў толькі адзін, здаецца нумар). Буду дзякаваць!..

Прышлеце мне ўзор малюнка да календара на 1913 рок!

Я ня атрымаў апошняе газэты з прошлай нядзелі!..

Бывайце здаровы і кланяйцеся ўсім нашым блізкім і дальшым беларусам!

Ваш Гальяш Леўковіч

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 11-13.*

12. Пісьмо Гальяша Леўчыка Антону Луцкевічу ад 13 (26).02.1913 г.

Варшава 13/26- II 1913 г.

Залаценькі Паночку!

У нашай справе канешне патрэба выпусьціць друкам на расейскай мове і асобна на польскай мове такую агітацыйна-інфармацыйную брашуру аб беларускам адраджэньні, як напрыклад вашые „Беларусы" (А. Новіны) і „Па дарозе...", толькі яшчэ дапоўніць характарыстыкай народнай, гісторыяй, бібліяграфіяй і асобнасьцямі беларускаго народа, штосьці ў духу стацьці проф. Пагодзіна[40] ў „Вестнике Европы"[41] аб беларускіх паэтах...

Такая кніжка нядорага каштавала б — грошы знашліся б — і яна была б надта вельмі памочна. Вы на гэта майстар! Калі ласка, адпішэце мне.

Ваш Гальяш Леўчык

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 11-13.*

13. Пісьмо Гальяша Леўчыка Антону Луцкевічу ад 06.08.1925 г.

Варшава — дн. 6/VIII — 1925 г.

Вельмі Паважаны Паночку!

Шчыра Вам дзякую за пісулю, што Вы мне прыслалі ў адказ на маю ў справе „Господняй Малітвы". Вашу параду я прыняў пад увагу. Но толькі Вы пішаце: „што тэкст, які ёсьць у Эвангельлі і які я ўласнаручна надпісаў Вам на экзэмпляры Вашага перакладу (пэўне яго Вы ўжо маеце), зусім узгоднены!!... Дык ня ведаю і не разумею — я ніякага надпісу „ўласнаручнага Вашага" на сваём эгзэмпляры не атрымаў. (?) Ці вы мелі мне яго пераслаць, ці Дзякуць[42], ці ён пашоў да Лодзі ў „компас"? Мне вельмі трэба мець тэкст Вашай „Госп[одняй]. Малітвы" з грэцкага, бо гэта важна і цікава ня толькі ведаць і мець, но і ўжо разпаўсюджваць яе! Мне казаў Ўласаў[43], што Вам прыслалі з Лодзі да карактуры толькі адзін аркуш ці сшыток эвангельля, дык мо ў ём і ёсьць яна, а калі не, то мо будзеце ў рукох сваіх мець, дык прасіў бы ласкава мне прыслаць яе. Ваш Г. Л.

[40] Пагодзін Аляксандр (1872-1947) — рускі гісторык і філолаг-славіст.

[41] „Вестник Европы" — расейскі часопіс, заснаваны ў 1802 г.

[42] Дзекуць-Малей Лукаш (1888-1955) — беларускі грамадскі і рэлігійны дзеяч.

[43] Уласаў Аляксандр (1874-1941) — беларускі грамадскі і культурны дзеяч, выдавец, публіцыст.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 11-13.*

14. Пісьмо Гальяша Леўчыка Антону Луцкевічу ад 20.07.1926 г.

дн. 20 ліпня 1926 г.

Паважаны Дзядзька!

Даю Вам яшчэ „горбу" літарацкіх матар'ялаў сатырычных аб „слаўных", нібы „беларускіх" „дзеячах" — думаючы, што яны Вам, а калі не Вам, дык мо „Маланцы"[44], або „Б[еларускай]. Справе"[45] да друку (у абрэзцы) прыдадуцца, а нават хацяб хай ляжаць сабе ў музейнам архіве, калі ня будзе адвагі ці мо грошы іх выдаць друкам ці ў газэтах, ці ў аддзельнай брашурцы, як сатыры. Але, калі ласка, усё-ткі адкажэця, прачытаўшы іх, мне, бо я ўпярош быў паслаў некаторыя з іх (апрача аб: „Ляк." і „Пав.") у рэдак. „Маланкі", ды там, відаць, баяцца зачапляць гэных асоб і нічога ня друкуюць і нават ня адказваюць мне, ці будуць друкаваць. А шкада! Бо матарыялы добрыя — проста гістарычныя! Праўдзівыя, узятыя з фактаў і жыцьця! Два толькі „Маланка" выдрукавала, а больш штосьці ня відаць — маўчаць, ня ведаю чаму? Каб штосьці ў аддзельнай брашуры, дык было-б разам у калекцыі 6 асоб — дый, думаю, што зараз разкупілі-б цэлы наклад! Трэба дадаць толькі рысункі карыкатураў. Была б знамянітая брашурка! Пад маім псэўданімам: „Гля-Гля-Бач". А мо нават і другіх іншых аўтараў да яе далучыць! (Аб другіх падобных ці іх-жа „Дзеячох").

З пашанай — Г. Л.

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 11-13.*

15. Пісьмо Гальяша Леўчыка ў рэдакцыю газеты „Беларускі Звон" з вершам „Трыолет", надрукаваным 13.05. 1922 г.

Вільно

Острабрамска 9

Рэдакцья газэты

«Беларускі Звон»[46]

в Вільне

[44] „Маланка" — ілюстраваны сатырычны часопіс прагрэсіўнага кірунку ў Заходняй Беларусі. Выдаваўся ў Вільні на беларускай мове з 15 студзеня 1926 г. Выйшлі 43 нумары.

[45] „Беларуская Справа" — газета, выходзіла ў Вільні з 9 красавіка па 31 ліпеня 1926 г.

[46] „Беларускі Звон" — газета, якая выходзіла ў Вільні з 6 студзеня 1921 г. па 2 снежня 1923 г.

Трыолет

Пасьвячаецца Ярашэўскаму за яго стацьцю: «Не..... [не разборліва]»

Жаваранкаў хоры цешаць нашу ніву,
Ўсюды Беларускі раздаецца стогн.
Режуць нам зямельку, мучаць голаў сіву...
Жаваранкаў хоры цешаць нашу ніву.

Беларус будуець вольную, шчасліву
Бацькаўшчыну родну, бацькаўскі загон —
Жаваранкаў хоры цешаць нашу ніву,
І чуваць нам ў сэрцы: «Беларускі Звон"».

1922. — ‖ — Гальяш Л.....

PS. Просіцца выдрукаваць у „Б[еларускім]. Звоні".

Крыніца: *Рукапісны аддзел Бібліятэкі Нацыянальнай Акадэміі навук Літвы, ф. 21, спр. 286, арк. 13.*

Siarhiej Czyhryn — poeta, literaturoznawca, historyk regionalista, dziennikarz. Mieszka i pracuje w Słonimiu.